**Summary**

The problem of choicing valuable directions for determination to the strategy of development modern Belorussian society is define. The process of coming-to-be and evolution views to the valuable determination of social activities in the history of spiritual culture of Belarus is reconstruct. The accent makes on the main landmarks of the history: the conversion from the paganism to the Christianity with raising of the spiritual values, the Renaissance with giving a meaning to the national and cultural forms of coming into being person, formulation of basic problems to the existential content in the fiction at the end 19$^{th}$ century – at the beginning 20$^{th}$ century, conceptual decision of the question about cultural and valuable self-determination of Belorussian society.

УДК 008.161.3

# ТВОРЧАСЦЬ У.КАРАТКЕВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ДУМКІ

**Банцэвіч П.К.**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У якасці рэпрэзентатара, камунікатара ідэй, іманентных каштоўнаснаму комплексу літаратуры і мастацтва як арганічнай часткі духоўнай спадчыны, выступае творца. У гэтых варунках, важнае месца ў гісторыі беларускай культуры займае постаць У.Караткевіча. Ён быў пісьменнікам, які падвергнуў застарэлыя паняцці і канцэпты крытыцы і стварыў на падставе дыялектычнага сінтэзу новыя мысліцельныя канструкцыі, актуальныя сэнсавобразы, якія пабуджаюць «аўдыторыю» на пошук і зацвярджэнне духоўнасці. Мастак у сваіх творах не толькі апісвае падзеі, адлюстроўвае адчуванні, афекты, якія перажывае асоба, але і мадэлюе з дапамогай метафарычнасці і асацыятыўнасці «другасныя» пачуцці і ўяўленні, падкрэсліваючы немагчымасць існавання чалавека па-за культурай і гісторыяй народу, па-за ўсведамленнем уласнай велічы і самабытнасці. Патрыятычныя, маральна-этычныя, эстэтычныя каштоўнасці творчасці У.Караткевіча вызначылі новыя вектары беларускай мастацкай літаратуры, публіцыстыкі, беларусазнаўства, акрэслілі кірунак дзейнасці творчай інтэлігенцыі.

Імкненне абудзіць нацыянальны дух і веру народу ў сябе як стваральніка каштоўнасцяў і захавальніка традыцый з’яўляецца той рэфлексіўна-пачуццёвай прасторай, вакол якой фарміруецца культуралагічны дыскурс У.Караткевіча.Ён вучыць правільна разумець паняцце беларускасці, якое было катастрафічна звужана і ў жыцці, і ў літаратуры да паняцця сялянскасці. Дзеля гэтага пісьменнік у сваіх творах

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГАУ

уздымае тэму арыстакратычнай шляхты, якая проці-пастаўлялася традыцыйнай «вясковасці» беларускай прозы, падкрэслівае галоўную ролю эліты ў культурна-гістарычным працэсе. Ідэі пісьменніка карэлююць з культуралагічнай праблемай «эліта-народ» (А.Тойнбі).

Працэс расколу паміж «вярхамі» і народнымі масамі беларускага грамадства суправаджаўся з'яўленнем біэтнічнай, а затым і зменёнай самаідэнтыфікацыі адукаванага слою насельніцва і маргіналізацыяй самаідэнтыфікацыі сялянства. У.Караткевіч разглядае праблему ўпадку духу творчай меншасці, якая праяўляе індыферэнтнасць да асіміляцыі ўласнай культуры, да страты палітычнай самастойнасці.Згодна з А.Тойнбі, у новастворанымі грамадстве актыўная маса вылучае з свайго асяроддзя пасіянарную творчую меншасць і творыць разам з ёй новую ідэю, рэлігію, форму жыцця. У.Караткевіч стварае вобраз змагара за народ і радзіму. Адметны нацыянальны генатып (герой-рамантык, народны заступнік, інтэлігент) акумулюе ў сабе шляхецкія і сялянскія рысы, гэта носьбіт аўтарскай ідэі еднасці правадыра і народу, шляхціца і мужыка. Вобраз тытанічнай асобы па-рознаму вар'іруецца ў творах. Гэта князь-мужык Алесь Загорскі («Каласы пад сярпом тваім»), мужыцкі кароль («Дзікае паляванне караля Стаха»), урэшце, гэта «мужыцкі Бог» («Хрыстос прызямліўся ў Гародні»). Такім чынам, У.Караткевіч суб'ектыўна-творча асэнсоўвае ідэю, аб тым, што народ-нацыя павінен мець сваю інтэлігенцыю, выразнікаў маральнай свядомасці, інтэлекту, ведаў і праўдашукальніцтва (М.Бярдзяеў). У.Караткевіч стварае ідэальнае ўяўленне аб народзе як аб адзінстве пакаленняў, аб этнічнай свядомасці як аб народным сумленні, у якім увасабляюцца нацыянальныя, маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці. Мастак рамантычна падымаецца над рэчаіснасцю і складае пра свой народ своеасаблівы нацыянальны міф. Народ у празаіка – суб'ект нацыянальнай ідэі і патрыятызму. З дапамогай ідэалізацыі творца імкнецца палепшыць канстантны вобраз свайго народу, рэальна спрабуе ўдасканаліць яго, вызначыць месца беларусаў сярод іншых этнасаў. Створаны пісьменнікам этнічны самавобраз мае пазітыўны характар і адпавядае свайму сацыяльна-гістарычнаму і псіхакультурнаму прызначэнню – кансалідацыі членаў этнасу ў адзінае цэлае, усведамленне ўласных калектыўных сіл і магчымасцяў.

Творчасць пісьменніка прасякнута ідэяй адраджэння, маральнага ачышчэння чалавецтва праз мастацтва. Разглядаючы пытанне ўзаемаадносін паэта і народу, У.Караткевіч набліжаецца да асноўных ідэй рамантыкаў аб усведамленні творчай функцыі інтэлігенцыі ў самасвядомасці этнасу (Ф.Шлегель). Пісьменнік выступае за вызваленне творчай асобы ад усялякіх рэгламентацый і канонаў (І.Кант), адраджае ідэал народнага песняра, паэта-прарока, што спалучае мастацкую творчасць з місіяй нацыянальнага героя, важака.

Выкарыстанне пісьменнікам матываў і сюжэтаў з міфалогіі — у тым ліку і з біблейскай — дапамагала ствараць не толькі глабальныя «мадэлі» развіцця грамадства, але і больш уважліва акцэнтаваць пэўныя сітуацыі і калізіі сучаснага жыцця. У.Караткевіч па-мастацку сцвярджаў думку пра выратавальную місію рэлігійных ідэй, якімі павінна поўніцца ўся чалавечая культура. Творца спалучае ўсё лепшае з духоўнасці язычніцтва, што зберагаў на працягу доўгай гісторыі народ, і лепшае з духоўнасці хрысціянства, якое моцнае агульначалавечымі, гуманістычнымі ўстаноўкамі. Пісьменнік звяртаецца да вобразу вялікай Маці-Радзімы, спасцігаючы сваёй мастацкай інтуіцыяй гэты велічны архетып. У спробе асэнсаваць першавытокі, генезіс культуры мастак набліжаецца да ўяўленняў К.-Г.Юнга і М.Эліядэ.

Нацыянальная культура, прасякнутая хрысціянскай свядомасцю, з'яўляецца творчым сродкам у праяўленні індывідуальных каштоўнасцяў кожнага этнасу, пошукаў боскага прызначэння, абавязку і свайго сэнсу ў сусвеце і тым самым апраўдвае сваё існаванне ў кантэксце сусветнай культуры. У.Караткевіч творча абыходзіцца з хрысціянскімі ідэямі, прыўносіць у іх нацыянальную адметнасць.

У рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» выяўляецца, магчыма, не ўсвядомленае да канца жаданне пісьменніка стварыць адсутны ў беларускай літаратуры біблейскі нацыянальны эпас. У.Караткевіч прыходзіць да вызначэння ісціны хрысціянскай як ісціны народнай. Галоўны герой як бы нанова адкрывае запаведзі божыя, што ў яго разуменні ідэнтыфікуюцца з маральнымі запаведзямі чалавека наогул. Але такі чалавек сам не народзіцца, яго трэба выхоўваць праз «не забі», «не ўкрадзі», «любі бліжняга свайго» — праз маральнае ўдасканаленне. І выхоўваць, найперш, у сабе, праз ачышчэнне ўласнай душы.

У творчасці мастака выразна выяўляюцца стылёвыя прыкметы барока. У імкненні выкарыстоўваць творчыя дасягненні народнай карнавальнай літаратуры пісьменнік падтрымлівае вопыт М.Булгакава, М.Гогаля, Ф.Рабле, Д.Свіфта, М.Сервантэса, М.Твэна. Мастацкая думка пісьменніка пераадольвае бар'еры часу і прасторы і свабодна арыентуецца сярод мноства «чужых» выказванняў. Для многіх твораў У.Караткевіча характэрна «многотонность» (М.Бахцін) апавядання, змешванне высокага і нізкага, сур'ёзнага і смешнага. Зварот У.Караткевіча да барочнага стылю дае ключ да расшыфроўкі сучаснай культуры і мастацтва. Алегорыі барока з'яўляюцца дамінуючымі спосабамі выяўлення творцам крызісных станаў у савецкім грамадстве, рэпрэзентуюць натуральную гісторыю разлажэння і ўпадку культуры. Пісьменнік убачыў магутны механізм самарэгуляцыі грамадства (культуры) у такой эмацыянальнай праяве як смех. Смех у яго творах выяўляе механічнасць, страту гнуткасці ў інстытутах грамадства, у



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

паводзінах чалавека і вызваляе ад іх праз смех як свабоднае праяўленне непрыняцця людзьмі падобных станаў.

У творчасці У.Караткевіча выразна праяўляюцца рысы постмадэрнізму, адным з вызначальных прынцыпаў якога лічыцца прынцып калажу, калі мастак працуе не з «чыстым», а з так ці інакш культурна асвоеным матэрыялам. Для стварэння свайго аўтарскага калажу У.Караткевіч выкарыстоўвае ў сваёй творчасці вершы Гесіёда, Дантэ, Гётэ, творы Скарыны і Рабле, апокрыфы, нямецкія балады, лацінскія эпіграмы, гістарычныя дакументы, рукапісы і інш. Пісьменнік удала спалучае ў сваіх творах рэальнасць і вымысел, апелюе адначасова да масы і эліты. У гэтым плане яго інтэнцыі суадносяцца з постмадэрнісцкай канцэпцыяй Л.Фідлера, у якой уздымаецца праблема межаў паміж рэальным і іррэальным, пісьменнік называецца «двайным агентам», паколькі павінен здзяйсняць у сваей творчасці сувязь рэальнасці тэхналагізаванага свету і міфа, адпавядаць у роўнай ступені і элітарнаму, і папулярнаму густам. Блізкія ідэі аб шматадраснасці мастацкага твору знаходзім у У.Эко, Ч.Джэнкса.

У.Караткевіча ўнёс уклад у распрацоўку праблемы сацыякультурнай памяці, якую мастак лічыў важнейшай духоўнай катэгорыяй, якая жывіць сучаснасць, дазваляе меркаваць пра будучыню, робіць справы чалавека асэнсаванымі і перспектыўнымі, без якой немагчыма дасягнуць росквіту высокамаральнага грамадства. У творах пісьменніка сацыякультурная памяць выконвае ролю кумулятара і транслятара духоўнага вопыту народу, прадуцыруе новыя ідэалы і стэрэатыпы, якія прызначаны мадэліраваць будучыню, узбагачаць нацыянальную карціну светаўспрымання, абуджаць павагу і цікавасць да сваёй гісторыі. У якасці духоўных рэферэнтаў сацыякультурнай памяці мастак вызначае эліту (шляхту, інтэлігенцыю). У.Караткевіч рамантычна ўзвышае былую славу беларускай шляхты, яе інтэлектуальныя і баявыя заслугі перад народам і гэтак жа рамантычна рэзка развенчвае маральна дэградаваную, адарваную ад нацыянальных інтарэсаў шляхту. Пісьменнік супрацьпастаўляе ёй свой народ, паэтызуе яго. Тут ідзе пошук ідэальнай мадэлі грамадства як магутнага сродку абуджэння нацыянальнай свядомасці.Гістарычныя падзеі і факты не перадаваліся пісьменнікам з навуковай дакладнасцю, вытлумачваліся суб’ектыўна-творча. Мастак падае ў якасці мінулага тое, што, па-сутнасці, з’яўляецца мэтай, а зусім не рэальнасцю (прыём гістарычнай інверсіі). У.Караткевіч акцэнтаваў увагу на тым, што, на яго думку, здольна найлепш выхоўваць цяперашнія пакаленні, свядома арыентаваўся на перыяды найбольшага росквіту культуры. Гісторыя рамантызаваная для адлюстравання гераічных і трагічных падзей была найбольш прыдатная. Рэфлексіі У. Караткевіча набліжаюцца да ідэі «настальгіі» як устойлівага вобразу больш прывабнага жыцця народу ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

мінулым. Гэтае паняцце звязана з міфам пра «залаты век» і ўключае ў сябе характарыстыкі этнасу, што вызначаюць яго самаацэнку, а менавіта, незадаволенасць цяперашнім станам народу ў параўнанні з мінулым, уяўленні пра патэнцыял супольнасці, ідэю стабільнасці і маральнай абгрунтаванасці культурных каштоўнасцяў дадзенага этнасу.

Для народу, які страціў сваю дзяржаўнасць, нацыянальную незалежнасць, ідэалізацыя мінулага, абсалютызацыя ў ім гераічных, гуманістычных пачаткаў былі з'явай прагрэсіўнай. Мінулае выступае як антыпод рэальнасці. Свабоднае жыццё продкаў успрымаецца як кантраст прыніжанаму становішчу сучаснікаў. Гэта павінна было абудзіць заняпаўшую свядомасць народу, які не адчуваў сваёй культурна-гістарычнай ідэнтычнасці.

Ва ўмовах жорсткай інстытуцыяналізацыі культуры зварот пісьменніка да культурных здабыткаў мінулых пакаленняў вызначаў яго прагу здзейсніць пералом ў грамадскай свядомасці, патрыятычна, маральна-этычна ўздзейнічаць на свой народ. У.Караткевіч глыбока адчуваў сваё прызначэнне: выводзіць сучаснікаў з цяжкага стану сэнсастраты, каштоўнасна-нарматыўнай разрэгуляванасці, выкліканай дэвальвацыяй ідэалаў. Пісьменнік імкнецца да маральнага абнаўлення грамадства. Ён асэнсоўвае праблему бацькоў і дзяцей ў рэчышчы рускай класічнай літаратуры, у традыцыях Ф.Дастаеўскага, Л.Талстога, І.Тургенева, А.Чэхава. Для мастака вобразы «бацькоў» і «дзяцей», «коласа» і «зерня» з'яўляюцца сімваламі ўяўленняў пра прычынна-выніковыя сувязі паміж мінулым, сённяшнім і будучым у гістарычным працэсе.

Рэтраспектыўнае пазнанне гістарычнага працэсу вядзецца У.Караткевічам з пераканаўчых навуковых пазіцый у адпаведнасці з прынцыпам дыяхроніі – ад спасціжэння легендарна-фальклорнай спадчыны праз яе сінтэз з гісторыяй сярэднявечча да асэнсавання шматаблічнага сучаснага жыцця беларускага народу. У.Караткевіч больш пільную ўвагу надае сярэднявеччу, даказваючы, што мы, сучасныя, родам якраз адтуль. У сваім разуменні ролі сярэднявечча ён сыходзіцца з канцэпцыяй М.Бахціна пра дзве культуры, ідэяй «вельмі працяглага сярэднявечча» Ж.Ле Гофа і тэорыяй Ф.Брадэля пра «час вялікай працягласці». Зварот У. Караткевіча да эпохі Рэнесансу з яе цікавасцю да чалавека і чалавецтва таксама невыпадковы. Тытанізм людзей Адраджэння заключаўся ў тым, што гэта былі вельмі вялікія, living рознабаковыя асобы, Постаці («як бы богі»). Імкненне да свабоды, барацьба за яе, пошукі ісціны, справядлівасці набліжаюць героя У. Караткевіча да Тыля Уленшпігеля Ш.Кастэра, Кала Бруньёна Р. Ралана, Майстра М. Булгакава.

У нарысе «Зямля пад белымі крыламі» пісьменнік імкнуўся



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

адлюстраваць светапогляд беларускага этнасу, уяўленне членаў супольнасці пра саміх сябе і ўласнай дзейнаснай актыўнасці ў свеце. Ён паспрабаваў асэнсаваць «карціну свету» (Р. Рэдфілд) беларусаў, пранікаючы ў яе з мэтай устанавіць дыялог з сваім народам. У гэтым сэнсе вялікая значнасць надаецца этнаграфічным ведам, якія фарміруюць этнакультурную ідэнтыфікацыю, спрыяюць пераемнасці культуры.

У вобразах, інтуіцыях мастака выяўляецца праблема супрацьстаяння агульнацывілізацыйнага, глабальнага і этнанацыянальнага, роднай культуры (О.Шпенглер). Пісьменнік ідзе тут ад канцэптуальнай канстатацыі вельмі балючай праблемы да прапаноў яе вырашэння на радзіме. У.Караткевіч бачыць прычыну крызіснага становішча сучаснага грамадства ў наступствах «масавай культуры» (Х.Артэга-і-Гасэт). Мастак праводзіць паралель паміж селянінам-працаўніком і цяперашнім нядаўнім гараджанінам, які вельмі спяшаецца засвоіць урбаністычныя здабыткі цывілізацыі ды пераймае найбольш прымітыўныя іх праявы. Творца заўважае, што нават адносіны паміж людзьмі набываюць характар суб’ект-аб’ектных, калі індывід губляе здольнасць успрымаць унутраны свет іншага чалавека, злучаецца з навязанымі яму нормамі і стандартамі (Г.Маркузэ). У.Караткевіч адчуваў праблему разбурэння этнічнай культуры, што з’яўлялася вынікам татальнай індустрыялізацыі і ўрбанізацыі. Тэма месца фальклору ў сістэме сучаснай культуры набывае ў творчасці мастака шырокае сацыяльнае значэнне, суадносіцца з праблемай выхавання чалавека і фарміравання сістэмы яго каштоўнасцяў (У.Конан).

Для мастака былі рэферэнтнымі праблемы культурнай камунікацыі, дыфузіі, рэцэпцыі, таму ён адлюстроўваў дыялог славянскіх культур, даследаваў ўзровень пісьменнасці, асветы сярод славян, узнікненне кнігадрукавання, рэфлексіраваў над ідэйна-эстэтычнымі і маральнымі каштоўнасцямі мастацтва, дэманстраваў асаблівую ўплывоўчую ролю беларусаў у станаўленні духоўна багатай, славянскай культуры.

У.Караткевіч абмяркоўвае пытанні аб дыскрэтным характары гісторыі, аб лёсе і своеасаблівасцях нацыянальнай культуры, аб прычынах яе росквіту і ўпадку. Яго цікавіць першаснае светаадчуванне беларускай культуры, з якога творца выводзіць усё багацце яе канструктыўных і сімвалічных форм. Мастак сцвярджае, што беларуская культура ўнікальна, мае свае жыццё, душу, волю, свае сімвалы, выяўляецца ў адметных архітэктурных, мастацкіх, моўных, палітычных, філасофскіх формах. Погляды У.Караткевіча, на нашу думку, нагадваюць канцэпцыю «душы культуры» О.Шпенглера.

Адзін з паказчыкаў сталасці нацыянальнай культуры ёсць яе кампетэнтнасць аб стане іншых культур, што дазваляе, з аднаго боку, пазнаць сваё, адметнае, а з другога – асэнсаваць сябе як частку агульна-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

чалавечага. Таму пісменнік папулярызаваў дасягненні сусветнай літаратуры сярод беларускіх чытачоў, бо праз вывучэнне моў і літаратур свету адбываецца працэс культурнай дыфузіі, асоба набывае магчымасць далучыцца да іншых культур, менталітэтаў. Такім чынам, У.Караткевіч прытрымліваецца традыцый вывучэння мовы ў непарыўнай сувязі з культурай канкрэтнага народу (В.ф.Гумбальдт, Э.Касірэр). Мастак мабілізаваў беларускіх літаратараў на пераклады еўрапейскай класікі, каб паказаць, што і па-беларуску можна высокім стылем выказваць самыя складаныя пачуцці і рэфлексіі і тым самым выклікаць павагу да сябе. Моўнае пытанне набыло для пісьменніка сацыякультурнае значэнне, нацыянальна-патрыятычны і ідэалагічны характар. Духоўная культура нацыі ўяўляе сабой іерархічную сістэму з шматлікіх структурных узроўняў. У аснове гэтай сістэмы ляжыць мова, праз якую этнас рэалізуе сваю калектыўную нацыянальную самасвядомасць. Мова выступае фактарам кансалідацыі грамадства, злучае пакаленні, выконвае трансляцыйную функцыю культуры, адлюстроўвае сацыякультурны вопыт.У.Караткевіч вызначае асноўныя шляхі адраджэння беларускай мовы, пераконвае ў прынцыповай неабходнасці нацыі мець нацыянальную адукацыю, ажыццяўляе рэтраспектыўны экскурс у гісторыю, раз’ясняючы, што за крытэрый культурнай ідэнтыфікацыі нашых дзеячаў культуры заўсёды бралася мова.

Таким чынам, вобразы, інтуіцыі, пошукі, сімвалы, ідэі ў творчай спадчыне мастака карэлююць з шэрагам культуралагічных канцэпцый: элітарнай (А.Тойнбі), дыялогу (М.Бахцін), этычнага гуманізму (І.Кант, А.Швейцар), фальклору (У.Конан), нацыянальнага адраджэння (І.Абдзіраловіч, М.Багдановіч), народнага духу (Ф.Шэлінг, Фр.Шлегель), карнавалу (М.Бахцін), постмадэрнізму (Ч.Джэнкс, Л.Фідлер, У.Эко), «душы культуры» (О.Шпенглер) і інш.. Культуралагічная спадчына У.Караткевіча актуалізуе праблемы свабоды творчасці, вышэйшай місіі мастацтва, этнічнай самасвядомасці, богашукальніцтва, суадносін масавага і элітарнага ў культуры (Х.Артэга-і-Гасэт), агульначалавечага і нацыянальнага (М.Бярдзяеў), культурнага і цывілізацыйнага (О.Шпенглер), маральнай адказнасці творцы і інтэлігенцыі, адлюстравання «татальнай» гісторыі (М.Блок, Л.Феўр) і інш.. Культуралагічны змест творчасці У.Караткевіча дэтэрмінуецца пошукам глыбінных асноў быцця беларускай культуры, яе сэнсаўтваральных і перспектыў развіцця. Дамінантай эпістэмалагічных уяўленняў У.Караткевіча з’яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых можна вылучыць нацыянальную самасвядомасць як фактар культуратворчасці, узвышэнне мовы, выхаванне моладзі праз веды, фальклор і мастацтва, вызначэнне ролі асобы ў гісторыі і культуры, фарміраванне павагі да сацыякультурнай

памяці, дэманстрацыйнае зацвярджэнне беларускіх каштоўнасцяў, заклік да актыўна-дзейнаснага патрыятызму, асэнсаванне нацыянальнай культуры ў славянскім і еўрапейскім культурным кантэксце, вывучэнне народу як суб'екту культуры, даследаванне беларускага нацыянальнага характару .

Творчасць У.Караткевіча з'яўляецца, па свайму характару, інтэрдыскурсіўнай. У ёй спалучаюцца, узаемадзейнічаюць, уступаюць у дыялог разнастайныя дыскурсы і парадыгмы. Рэмінісцэнцыі сярэднявечча, метафарычнасць барока, рацыяналізм класіцызму, суб'ектыўна-пачуццёвы свет рамантызму, інтэртэкстуальнасць і інтэрпрэтатыўнасць постмадэрнізму фарміруюць агульную прастору беларускай культуры, узбагачаюць псіхалагічным зместам, падкрэсліваюць яе самабытнасць і непаўторнасць, прапануюць чытачу ўвайсці ў іманентны свет розных эпох і часоў. Створаная такім чынам полісемантычная структура мастацкага тэксту дазваляе спасцігнуць глыбінныя, сімвалічныя асновы ўласнай культуры. Шматаспектнасць дзейнасці пісьменніка і паліфанічнасць яго творчасці садзейнічаюць пашырэнню грамадскай цікавасці да гісторыі, уплываюць на развіццё гістарыяграфічнага жанру «партрэціравання» эпохі, выяўлення яе ментальнасці .

У большасці твораў пісьменніка ўздымаецца праблема сутнасці культуратворчай працы на карысць нацыянальнай культуры. Мастак адзначаў, што на сучасным этапе развіцця Беларусі, якая адчувае на сабе глабальныя працэсы індустрыялізацыі і урбанізацыі, рэзка ўзрастае роля дзяржаўных структур у адбудове, захаванні і развіцці беларускай культуры. Пісьменнік акрэслівае задачы дзяржавы, па-сутнасці, фармулюючы асновы культурнай палітыкі, яе ідэйную скіраванасць у розных сферах мастацтва, адукацыі, экалагічнага выхавання, культурнага адраджэння.

Літаратура:


1. Бахтин М.М. Творчество Ф.Рабле и народная литература средневековья и Ренессанса. – М.: Худож. лит., 1990. – 541 с.
2. Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т./ Мінск.: Маст. літ., 1987-1991.
3. Конан У.М. Архетыпы нашай культуры // Адукацыя і выхаванне.– 1996.– №1.– С.3-10.
4. Культурология. XX век. Словарь / Под общ. ред. А.Я.Левита. – СПб.: Университетская книга, 1997. – 640 с.
5. Тойнби А. Постижение истории. – М.: Прогресс, 1991. – 736 с.
6. Фидлер Л. Пересекайте рвы, засыпайте границы // Современная западная культурология: самоубийство дискурса. – М.: АСТ, 1993. – 221 с.
7. Философия культуры. Становление и развитие. // Под ред. М.С.Кагана. – СПб.: Изд.-во «Лань», 1998. – 448с.
8. Шпенглер О.Закат Европы.– Новосибирск: ВО Наука, 1993.–572 с.



**Рэзюмэ**

Духоўная спадчына У.Караткевіча разглядаецца праз прызму культуралогіі і трактуецца як з'ява не толькі ў літаратуры, але і ў




РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

культуры. Выяўлены інтэнцыі творчасці пісьменніка (вобразы, сімвалы, праекты, прадбачанні, інтуіцыі), якія маюць непасрэднае дачыненне да глыбокага пазнання асаблівасцяў, традыцый і будучага беларускай культуры. Раскрыты ўклад мастака ў рэабілітацыю беларускай гісторыка-культурнай прасторы, у актуалізацыю біблейскіх матываў у беларускай літаратуры.

**Summary**

**V.Korotkevitch's work in contekst of modern cultural science think**

**Bantsevitch P.K.**

V.Korotkevitch's spiritual legacy is considered in the light of cultural science and treated not only as cultural phenomenon. The intentions (images, symbols, projects, intuitions, foresights) of the writer's work are found. They are connected with deep knowledge of peculiarities, traditions and the future of Belarussians culture. It allowed to show the contribution of the writer to rehabilitate Belarussian history and culture, to actualize the Bible motifs in Belarussian literature.

УДК.130.2

## «АПОЛЛОН» В КОНТЕКСТЕ ФИЛОСОФСКИХ ИДЕЙ ЭПОХИ «СЕРЕБРЯНОГО ВЕКА»

**Забелина Е.Н.**

УО «Гродненский государственный университет имени Я.Купалы»
г. Гродно, Республика Беларусь.

К эпохе «Серебряного века» в настоящее время обращают свои взоры исследователи разных областей научного знания. Политиков интересуют социальные утопии и концепции политического переворота начала века, экономисты изучают экономические потенции России предреволюционного периода, философы анализируют культурфилософские процессы и явления. Проблема специфики культурфилософской рефлексии «Серебряного века» возникла не случайно. Она тесно связана со специфическим славянским эмоциональным художественным восприятием, осмыслением себя и окружающей действительности, корни которой уходят глубоко в прошлое в неакадемическое русское философствование.

Испокон веков на русской почве философия, литература, художественная культура, религия, политика очень тесно взаимодействовали, а подчас переплетались и взаимопроникали. Философский процесс «Серебряного века» также характеризуется тесным сосуществованием с религиозными и эстетико-художественными исканиями русских мыслителей. Философия воздействовала на сферу чувств человека, облачившись в художественные одежды. Философские идеи Э.Канта, Ф.Ницше, В.Соловьева обсуждались в московских и петербургских «обществах»,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ